*Карані і атожылкі*

Ірына ГОЎЗІЧ

# НАСУСТРАЧ СВЯТЛУ

## ПРАБЛЕМА ПРАСВЯТЛЕННЯ НАРОДА Ў ТВОРЧАСЦІ ЯНКІ КУПАЛЫ І ЯНКІ СІПАКОВА

Праблема, вынесеная ў загаловак артыкула, мае не прыватны, а агульначалавечы, філасофскі характар. Гэта тлумачыцца многімі аб'ектыўнымі і – у большай ступені – суб'ектыўнымі фактарамі, сярод якіх ці не галоўны заключаецца ў паступовым прасвятленні чалавецтва ў многіх кірунках яго дзейнасці. У сваю чаргу, такі працэс надзвычай складаны, доўгі, эвалюцыйна-рэвалюцыйны. У ім удзельнічаюць часта неасвечаная маса і прарокі, відушчыя, дзякуючы якім і адбываецца паступовае далучэнне невідушчых да відушчасці. У маральна-этычным плане "відушчасць – невідушчасць" – праблема свядомасці і несвядомасці, ведання і няведання, святла і цемры, маральнай адухоўленасці і духоўнага (усвядомленага ці неўсвядомленага) заняпаду.

З прычыны адзначанай важнасці, дамінантнасці акрэсленая намі праблема і ў фальклоры, і ў літаратурнай творчасці розных народаў мае амаль ідэнтычнае мастацкае ўвасабленне і вырашэнне. Ужо ў старажытнагрэцкай літаратуры ў трагедыі Эсхіла "Прыкуты Праметэй" знаходзім радкі пра тое, як Зеўс пакараў тытана цемрай, пазбаўленнем яго святла. Цар Эдып з аднайменнай трагедыі Сафокла сам сябе асляпіў, каб не бачыць сонца, сваіх дзяцей, якім прынёс толькі пакуты, каб не бачыць сябе самога і не радавацца жыццю, бо не ўсё на самай справе такое, якім мы яго бачым.

Амаль пра тое самае сведчыць і змест Біблії, вузлавыя сэнсавыя моманты Кнігі Кніг. Адна з першых спробаў распрацоўкі названай праблемы была зробленая яшчэ ў Новым Запавеце. Хрыстос – сын Бога – усё бачыць і ўсё чуе, а астатнія – сляпыя, невідушчыя, яны не разумеюць сапраўднай сутнасці рэчаў, а з'яўляюцца адно толькі абыякавымі (у большасці) сведкамі ўкрыжавання Прарока на Галгофе. Апосталы ж па сваёй сутнасці, хутчэй за ўсё, недабачваюць, не разумеюць напоўніцу свайго шляху як неад'емнага ад шляху Хрыста. Біблія сцвярджае, што розум адыгрывае ці не апошнюю ролю ў самапазнанні і самаразуменні ў такім кірунку. Галоўнае ж тут – Вера. Вера ў правільнасць выбару і бездакорнасць пазіцыі Хрыста як носьбіта ідэй святла, бачання: "І казаў Ісус: на суд прыйшоў я ў свет гэты, каб невідушчыя бачылі, а відушчыя аслеплі" (паводле Яна, 9 : 39). Падобныя матывы ёсць не толькі ў хрысціянскім вучэнні, але і ў старадаўніх паганскіх вераваннях нашых продкаў: заўсёды знаходзіліся пракрокі, якія вялі за сабой народ, бачылі свет пасвойму (іх называлі ўладарамі, вешчунамі, старэйшынамі) і таму імкнуліся выкарыстаць іншых, невідушчых, у сваіх мэтах. Узнікае пытанне, на якое можна даць адказ толькі ведаючы гістарычны і філасофскі падтэкст пастаўленай праблемы. Як часта відушчыя прарокі аказваюцца ілжэпрарокамі, што цягнуць людзей за сабой у багну, не шануючы значныя каштоўнасныя арыенціры? Адказаць магчыма пры больш шырокім падыходзе да разумення тэмы, пры пэўным пераносе праблемы з плоскасці літаратуразнаўства ў плоскасць філасофіі. У агульным філасофскім плане "відушчасць" – святло, Бог, Дабро, а "невідушчасць" – цемра, Д'ябал, Ліха. Гістарычна і дыялектычна гэтая праблема залежыць ад супрацьстаяння Неба, Вышыні і Зямлі, Нізу. Як знайсці раўнавагу паміж гэтымі полюсамі? Ці мае права кожны чалавек выбіраць свой лёс, свой шлях, які можа прывесці зусім не туды, куды марыць патрапіць на першы погляд і ён сам і многія іншыя ("Дарога ў пекла выкладзеная добрымі намерамі")? Таму вельмі важна вызначыць каштоўнасныя крытэрыі ацэнкі праблемы: відушчасць – імкненне да дабра і святла, да разумення сапраўднасці абранага шляху і адказнасці за невідушчых, якія пойдуць за табой; невідушчасць – цемра, цяжкі, пакутны сон, якога павінен пазбавіцца чалавек, каб пачаць жыццё ўжо паводле новых правілаў дабрачыннасці.

Матыў "відушчасць – невідушчасць" пазней, у літаратуры XVIII – пачатку XIX ст., сацыялагізаваўся: відушчы – гэта ўжо не толькі прарок, але і мастак з актыўнай грамадзянскай пазіцыяй ("Вяльможа", "Уладарам і суддзям" Г. Дзяржавіна, "Гора ад розуму" А. Грыбаедава, "Падарожжа з Пецярбурга ў Маскву" А. Радзішчава, грамадзянская лірыка А. Пушкіна, "Роздум каля параднага пад'езда", "Чыгунка", "Каму на Русі жыць добра" М. Някрасава і інш.).

Такім чынам, да сярэдзіны XIX ст. праблсма "відушчасць – невідушчасць" была ў большым распрацаваная: пастаўленыя галоўныя пытанні, высветленыя шляхі адказаў (на аснове не толькі багатай спадчыны славянскіх народаў, але і еўрапейскіх здабыткаў).

У беларускай літаратуры распрацоўка разглядаанай праблемы была закладзеная Францішкам Багушэвічам, большасць твораў якога складае пласт грамадзянскай лірыкі з выхадам на агульны роздум пра магчымасці прарокаў і ўладароў гэтага свету: спіць мужык-беларус, не бачыць ці знарок не хоча заўважаць здзекаў, што загналі яго ў труну, але ён не мёртвы, ён можа прачнуцца, абудзіцца, калі сам, расплюшчыўшы вочы, зразумее абсурднасць падобна-

*Звесткі пра аўтара змешчаны ў № 2.*

га становішча. У творчасці гэтага выдатнага паэта, такім чынам, адбывалася пераацэнка каштоўнасцяў, з агульнафіласофскай плоскасці пытанне пераводзілася ў чыста практычную і сацыяльную. Згадваецца з такой нагоды і знакамітае выслоўе Фрыдрыха Ніцшэ з кнігі "Так казаў Заратустра", што "Бог памёр", а Дабро і Зло памяняліся сваімі месцамі, страцілася мяжа паміж імі. Відушчыя сталі ў Ф. Багушэвіча ілжэпрарокамі, носьбітамі Цемры і Пустэчы, а сапраўдны прарок яшчэ не прыйшоў, паэт толькі рыхтаваў людзей да яго з'яўлення.

Янка Купала прапанаваў сваё вырашэнне праблемы. Паняцце "невідушчасць" атаясамліваецца ў яго глыбокай пафаснай грамадзянскай лірыцы з вобразам беларусаў – цёмных, сляпых, глухіх, забітых і загнаных. Заканамерна з'яўляецца вобраз слепаты, які набывае мастацкі сінонім – сон. Ужо ў адным з самых ранніх вершаў паэт намаляваў удалы і дакладны, канкрэтны і адначасова абагульнены (але не абстрактны, не адцягнены) партрэт беларусаў: яны – пагарджаныя, сляпыя, глухія. Падобны матыў ёсць і ў вершах "З песень аб маёй старонцы" (*"цёмны, цёмны народ гэты"*), "Я мужык-беларус" (*"цёмен сам"*), "Песня аб песнях" (*"цёмны, як скот"*), а вобраз цемры атрымаў тут шырокае значэнне – *"неадукаваны, забіты"*. Але найбольш выразна на раскрыццё азначанай тэмы працуе скразны сімвалічны вобраз сну. Спіць родная старонка, спіць народ беларускі, бо звялі яго да такога непрывабнага, жахлівага стану ўладары-ілжэпрарокі, пачвары ў людскім абліччы. Сон – прычына невідушчасці, часовы (спадзяваўся паэт) стан беларускай супольнасці. Два з паэтавых вершаў нават і назвамі сваімі адпавядаюць выказанаму намі асноўнаму тэзісу:

*__Спі,__ а можа хто заблудзе*
*У твой бедны край*
*І цябе з душой разбудзе, –*
*Крыкне: "Уставай!"* [1, 33].
А ты, браце, спі!

*Толькі ты, брат, адзін,*
***Як забіты, ляжыш***
*І на долю сваю*
*Не ўстаеш, **не глядзіш*** [1, 65].
Што ты спіш?

Жыццё ў Беларусі на пачатку XX ст., паводле Янкі Купалы, ідзе *"як сон у магіле"*, і таму для раскрыцця сваёй думкі не толькі пра шкоднасць, але і пра марнасць, дзікунства падобнага стану нацыі ён паставіў побач з назоўнікам *сон* прыметнікі, што выконваюць ролю ацэначных, эмацыйных эпітэтаў, – *аслепны, марны, ланцужны*. Праз рэалізацыю прынцыпу высокай вартасці і каштоўнасці мастацкага слова паэт авалодаў новай вышынёй свайго таленту, перайшоў ад выяўленча-апісальнага адлюстравання рэчаіснасці і раскрыцця праблемы невідушчасці як летаргічнага сну да эталагічнай і філасофска-медытацыйнай яе інтэрпрэтацыі, калі лірычны герой аказваецца тоесным мастаку і не толькі заклікае людзей *"працерці вочы"* і прачнуцца, але і ўзвышаецца над трагічнымі абставінамі, выходзіць на пошукі прычыннай сувязі гэтай праблемы з іншымі, застаецца відушчым, нягледзячы ні на што:

*Хоць і скуюць мне рукі й ногі,*
*Хоць зрэнкі выдзеруць з вачэй, –*
*Душой я вольны чалавек,*
*І гэткім буду цэлы век!* [1, 49].
Песня вольнага чалавека.

Паэт спачуваў родным людзям, яго душа крывавілася ад бачанага: *"аж хоць кладзіся ў магілу і свету гэтага не бач"* ("З песень аб бітвах"). Ён шукаў выйсце з трагедыйнай сітуацыі і, як сапраўдны мастак-грамадзянін, знайшоў паратунак у роднай мове, матчынай песні, навуцы, якія выведуць невідушчых на святло з цемры, расплюшчаць ім вочы на сапраўдную (адносна, вядома) ісціну і дапамогуць актыўна супрацьстаяць захопнікам і знішчальнікам духоўных каштоўнасцяў, якія ператвараюць беларусаў у чужынцаў на роднай зямлі ("Груган", "Беларускія сыны" і іншыя творы 1918 – 1920-х гг.).

У Янкі Купалы матыў узыходу сонца перакрыжоўваўся з матывам абуджэння прыроды, чалавека, беларусаў ад сну, з матывам адраджэння, абнаўлення, набыцця людзьмі новага зроку, бо сонца ўвасабляе і родную мову, якая чорны павой здымае з вачэй. Так нарадзіліся ў паэта гімны сонцу і мове: "Песня сонцу", "Роднае слова". Вясной, калі абагрэе сонейка зямлю і абудзіцца прырода, народ павінен прачнуцца. Але штовесну такія надзеі не спраўджваюцца. Вялікдзень набывае ў паэта новае значэнне: гэтае свята – своеасаблівая мяжа, пасля якой, так хочацца верыць, многае адродзіцца да новага жыцця. Вось так нечакана ў Янкі Купалы тэзіс пра ўваскрэсенне Хрыста ператварыўся ў тэзіс пра адраджэнне і ўваскрашэнне Беларусі. У такі час духоўнага катарсісу лірычнаму герою здаецца, што ўжо днее, што праходзіць асляпленне і нарэшце цэлая нацыя выходзіць з цемры да святла:

*Хрыстос васкрос!.. К табе, о Божа,*
*І я ў дзень гэты просьбу шлю:*
*Хай Беларусь, мая старонка,*
*Уваскрэсне к вольнаму жыццю!* [1, 165].
Хрыстос васкрос!..

Падобныя, на жаль, цяжка і марудна здзяйсняльныя мары выклікаў у паэта Новы год, калі хацелася верыць, што наступны час будзе лепшы: *"Дай свабод, Новы год, / Долю дай, / І ўскрасі, прасвяці / Родны край"* ("На Новы (1914) год").

Але ілжэпрарокі і цемнатворцы робяць усё магчымае і немагчымае, каб не даць беларусам выйсці з *"беспрытоння"*, стаць відушчымі. Яны не толькі, паводле словаў Я. Купалы, забілі нашу Радзіму, але і *"вочы вырвалі ёй"* ("Суды"), зацснулі народ, *"крыўдай сляпілі"* яго ("Выйдзі...").

Паэт шукаў прарока, відушчага, які змог бы вывесці да святла і зрабіць годнымі былых рабоў, але такі прарок часта з'яўляецца не да часу. Народ на пачатку XX ст. не мог яшчэ яму паверыць і пайсці за ім:

*Так гаварыў і з рабства клікаў*
*Людзей на волю той прарок,*
*Ждучы з трывогаю вялікай*
*Ад іх адказу неўнарок.*
*А людзі, глянуўшы на сонца,*
*Адказ казалі грамадой:*
*– Па колькі ж нам дасі чырвонцаў,*
*Калі мы пойдзем за табой?* [1, 197].

Прарок.

Дык што ж тады застаецца рабіць мастаку слова? Застаецца спадзявацца на моладзь, вочы якой не спавітыя зманам, – *"Ты разбудзіш прыспаныя сілы"* ("Моладзі"), і на родную песню, мову, што *"развеяла цемры, узлячыла сляпых"*, на свае вершы, якія рыхтуюць глебу і сеюць зерне відушчасці ў народзе. Хоць Янка Купала, заўважым, не называў сябе катэгарычна Прарокам, здольным павесці за сабой, не лічыў сябе адзіным відушчым, але здарылася менавіта так. І гэта зразумелі мы, беларусы, пазней, пасля яго смерці: як любы прарок, ён апярэджваў свой час, сягаў думкамі ў будучыню, у наша сёння.

Вобраз відушчасці ў Янкі Купалы мае шматланцуговы характар: каб людзі сталі відушчымі, ім патрэбныя ў адначассе Прарок, Пясняр, Ваяр, Уладар. Першы ўсё бачыць і пры дапамозе другога апавядае пра гэта, трэці, узгадаваны і падрыхтаваны папярэднімі, змагаецца за прыйсце сапраўднага Уладара, які зможа павесці за сабой нацыю, будзе турбавацца і клапаціцца пра яе самачыннасць і годнасць, расплюшчыць вочы невідушчым ("На Куццю"). Падобныя думкі не пакідалі паэта нават у савецкія гады, калі ён не толькі бачыў з'яўленне новых ілжэпрарокаў і правадыроў ("Прамова на 15-годдзе літаратурнай працы"), але і папярэджваў пра тое, што яны прагнуць зноў асляпіць беларусаў пустымі абяцанкамі: *«На беларускай зямлі было і цяпер шмат ёсць фальшывых пракокаў, шмат рэнегацкіх душ, што за лыжку поснай паліўкі з чужой міскі запрадаюць сябе і свой народ у рабства чужынцам, але гэтага няма чаго баяцца. У адным з псалмаў біблейскіх сказана: "стануў Бог у зграмаджэнні Багоў і паміж Багамі суды судзіць". Будзем верыць, што і ў нас, беларусаў, прыйдуць новыя людзі, новыя прарокі і будуць па-божаму над фальшывымі прарокамі і прадажнымі душамі суды судзіць, з пакалення ў пакаленне пракляццямі ўспамінаць»* [1, 351 – 352].

Такім чынам, паводле Янкі Купалы, відушчы, Прарок – гэта грамадзянін, грамадскі чалавек, стратэг, які часта прадбачыць трагедыйную сітуацыю і даводзіць пачатую справу да канца, хоць сляпыя, як краты, суродзічы часта і не бачаць, і не чуюць яго. Таму паэт выйшаў не толькі на сацыяльны план, але і на план нацыянальны, агульначалавечы, філасофскі ў раскрыцці праблемы "відушчасць – невідушчасць", якую ён і ўвасобіў у вершах, паказаў трагедыю народа, які сам сябе не бачыць і не чуе, страціў святло і волю і прабіваецца да іх праз завею ("Паязджане").

У творцаў пазнейшай пары праблема "відушчасць – невідушчасць" не толькі развіваецца далей, але і рэалізуецца праз новыя ідэі, вобразы, тэмы. Так, у Васіля Зуёнка ёсць верш "Зрок" (ЛіМ. 2002. 31 мая), прысвечаны выдатнаму культурнаму дзеячу Міколу Ермаловічу, які, амаль сляпы фізічна, адкрываў далягляды беларусам, здымаў з іх вачэй павой маны і няведання:

Верыў: праўдай трымаецца свет, –
Летапісец не мусіць быць хлусам.
З тым і жыў – як жыве запавет:
Зрок вярнуць сляпым беларусам.

Янка Сіпакоў таксама зрабіў значны ўнёсак у распрацоўку гэтай праблемы. Ён перанёс яе разгляд са сферы сацыяльна-палітычнай у сферу маральна-філасофскую, біблейскую. Пачатак падобнага падыходу мы знаходзім у баладах паэта. Толькі адзін маленькі хлопчык бачыць сапраўдны сэнс дзеянняў доктара-фашыста, які не лекі, а смерць рыхтуе дзецям, "заплюшчваючы" іх даверлівыя і такія бездапаможныя вочы абяцаннямі пра ежу, даючы ім у кволенькія ручкі цацку-мячык ("Мячык. Польская балада. XX стагоддзе"). Пустэльнік, былы манарх Аляксандр Першы, таксама зразумеў сапраўдны сэнс свайго існавання і скінуў цяжар святасці царскае: *"Ах, людзі! Якія ж вы дзіўныя. / Вы самі святых ствараеце. / Прагнеце, / Каб хоць нехта быў над вамі ўладаром"* [3, 277]. Жорсткі Пётр Першы ў кузні станавіўся зусім іншым чалавекам, здольным працаваць у супольнасці простых "рабоў", атрымліваў незвычайную асалоду ад цяжкай фізічнай працы ("Кузня. Руская балада. XVIII стагоддзе"). Асабліва яскрава ў баладах Янкі Сіпакова паказаны прычыны невідушчасці людзей: кожная ўлада, як бы яна ні прапагандавала абарону інтарэсаў падначаленых, заўсёды ўсталёўвае свае законы і правілы жыцця, існавання, праграмуе чужыя думкі, прыхоўвае ад людзей шматлікія благія ўчынкі тыранаў, а калі трэба, то нават "выпальвае" вочы бяльмом закону сваім марыянеткам і служкам. Асоба ў баладах паэта заўсёды супрацьстаіць падобным дзеянням. Францішак Скарына – славуты асветнік – едзе на Беларусь прасвятляць людзей, друкаваць кнігі на роднай мове, бо ведае, што галоўнае для простага чалавека – асвета, а кніга дорыць святло, як Бог. Ды вартаўнікі любымі сродкамі хочуць асляпіць народ і пазбавіць яго душы:

*– Павінен*
*Сказаць я табе, чалавеча,*
*Што ты – кацянятка сляпое:*
*Можна паліць і святое, калі нам загад ёсць на тое*
[3, 14].

Але найбольш распрацаваная гэтая праблема ў прыпавесцях пісьменніка. Тут выкарыстаныя складаныя алегорыі, насычаныя шматлікімі метафарамі, асацыяцыйнай вобразнасцю. Паводле азначэнняў літаратуразнаўцаў, "прыпавесць – невялікі алега-

рычны аповед павучальнага характару". У прыпавесцях, як казаў Францішак Скарына, схаваная "мудрасць, як сіла ў дарагім камені, і золата ў пяску, і ядро ў арэху" [2, 255].

Чаму адны людзі бачаць (відушчыя), а іншыя не бачаць ці не хочуць разумець прыхаваную ад павярхоўнага зроку сутнасць справаў (невідушчыя)? Усё даволі проста: мала хто можа адкрыта супрацьстаяць, як, напрыклад, Хрыстос, драматычным падзеям, абставінам, калізіям і парадоксам гісторыі. Так і мы, беларусы, у большасці сваёй падобныя да чарвякоў з прыпавесці Янкі Сіпакова "Н а п е р а д, н а п е р а д", што ідуць наперад і знішчаюць усё на сваім шляху, бо пры гэтым нічога не трэба рабіць, а *"тыя, што ідуць наперадзе, і думаюць, і вырашаюць за сябе, за цябе, за ўсіх"* [4, 31]. І толькі адзін чарвяк засумняваўся ў справядлівасці такога механічнага дзеяння, пачаў думаць, ці туды яны ўсе ідуць, і адразу ж быў раструшчаны разам з аднадумцамі-смельчакамі, да яго падобнымі, бо *"рабы не дазваляюць сабе такой раскошы – думаць, што яны вольныя"* [4, 33].

Людзі з прыпавесці "Д а р о г а" спяшаюцца ў нейкую светлую будучыню, едуць на машынах у рай, ва унісон прамаўляюць: *"Хутчэй! Хутчэй! Едзем! Едзем!"* І толькі адзін чалавек (той самы чарвяк у новым абліччы) *"паціскаў плячыма – навошта? куды?"* [4, 49]. Ён, адзіны відушчы ў такіх абставінах, не можа не сумнявацца, чаму дарога вядзе толькі ў адзін бок, чаму людзі едуць без багажу і рэчаў. А дарога вядзе ў бездань. Туды падаюць машыны, там гінуць сотні, тысячы людзей. Ды такое адкрыццё цікаўнаму абышлося дорага: ён не толькі зразумеў, што *"не заўсёды там рай, дзе нам здаецца, куды мы прагнем і хочам, куды з радасцю спяшаемся"* [4, 52], але і ўсвядоміў, што сам рана ці позна апынецца ў бездані. Часта мы – толькі пластылінавыя людзі, вылепленыя ўладай для задавальнення яе інтарэсаў, жывем па яе правілах і законах. Але рана ці позна сярод невідушчых пластылінавых людзей знойдзецца ці народзіцца відушчы прарок, які вызваліцца з ланцугоў Рухомых, навучыцца бачыць, хадзіць, уладарыць і весці за сабой іншых ("П л а с т ы л і н а в ы я л ю д з і"). Справа, як нам думаецца, у тым, што так званыя Уладары часта падпарадкоўваюць значна мацнейшых за сябе. Пры гэтым адбываецца падмена каштоўнасцяў: *"Слабыя спрадвеку кармілі моцных, а моцныя рабілі выгляд, што толькі дзякуючы менавіта ім жывуць і кормяцца слабыя"* [4, 95] ("С л а б ы я і м о ц н ы я"). Мудрацы-прарокі, як заўсёды, у "бязглуздыя дні" аказваюцца не да месца, а прайдзісветы займаюць ганаровыя пасады.

Працягваецца гэтая тэма і ў прыпавесці "В ы г н а н н е д э м а н а ў". Ілжэпрарок, ілжэсвяты, ілжэправадыр часта дзякуючы красамоўю прымушае людзей бачыць толькі тое, у што верыць сам, пераконвае людзей у іх грэшнасці. А на самай справе не прарокі і святары, а толькі *"вернікі часцей за ўсё бываюць святымі"* [4, 85]. Біблія дапамагае нам адрозніць прарокаў і ілжэпрарокаў па іх дзейнасці і справах. А бездакорна сумленных і правільных людзей не было і не будзе. Ілжэпрарокі і нячысцікі так удала маскуюцца пад праведыроў, святых, што толькі вока мудраца, які ведае, што ўсе людзі грэшныя і ён сам не выключэнне з агульнага правіла, знойдзе і выкрые такіх прайдзісветаў.

Заключнай кампазіцыйна, але цэнтральнай па сіле пастаноўкі і вырашэння філасофскай праблемы "відушчыя – невідушчыя" з'яўляецца прыпавесць "Т ы я, ш т о і д у ц ь". Яна перагукваецца з вершам Янкі Купалы "А хто там ідзе?", толькі па змесце больш складаная, філасофская, цяжка зразумелая, вытрыманая ў постмадэрнісцкім стылі, які спалучае рэальны і віртуальны свет, разнапланавыя вобразы. Пачынаецца твор з апісання натоўпу людзей, якія некуды ідуць. Аўтар адзначае, што людзі нібы *"плылі ў вадзе ці, наадварот, рухаліся ў беспаветранай прасторы"* [4, 155]. Так звычайныя смяротныя не ходзяць. Пісьменнік адразу скіроўвае ўвагу на людскія рукі: яны выконваюць ролю страчаных органаў пачуццяў – імі людзі-здані не толькі размаўляюць, але і адчуваюць, выказваюць эмоцыі. Хто ж вядзе гэты натоўп? Барадзень, ён жа Белабог (ці не бог-дух Беларусі?), ён жа Валадар, Галоўны Сейбіт, які адзіны прызнаў Незнаёмага, што сустрэўся на шляху зданям. Зноў-такі пры дапамозе апісання рук пісьменнік раскрывае характар самога Белабога: *"Рука таксама, як і сам Барадзень, была моцная, верная, надзейная"* [4, 155]. Янка Сіпакоў нібыта падкрэслівае, што такія рукі могуць быць толькі ў сапраўднага гаспадара, працаўніка Зямлі, яе ахоўніка. Значна пазней Выпадковы бачыць і разумее, што ўсе, уключаючы яго новага знаёмага, не толькі сляпыя, але і нямыя, і глухія. Жывуць гэтыя істоты нібы ў іншым вымярэнні. Нават дарожны пыл не прыстае да іх. Але куды ідуць такія людзі, чаго хочуць? – пытаецца праз Незнаёмага аўтар сам у сябе і ў чытача. І спрабуе адказаць на пытанне неаднаразова – у залежнасці ад развіцця характару і светаўяўленняў Незнаёмага (ён жа Выпадковы для невядомага племені, і Падарожнік, і Спадарожны, і Вар'ят сам для сябе, і Вандроўнік для звычайных людзей). Чаго народ *"зняўся з даўно наседжанага месца і ўлегцы, нічога не ўзяўшы з сабою, пайшоў у свет"* [4, 158], чаму сапраўдныя хлебаробы, сейбіты, цесляры, муляры кінулі свае вёскі і гарады і нешта шукаюць? Дзе падзеліся і вырадкі, і прайдзісветы? Чаму яны не пайшлі з усімі? А можа, недарэкі зніклі па дарозе? Вось адзін з адказаў на гэтыя пытанні: *"...рух і ёсць іх жыццё, а канчатковы вынік – нішто..."* [4, 159]. Чым далей рухаецца з глухімі і нямымі людзьмі Выпадковы, тым шырэй прыадчыняецца завеса таямніцы над філасофскім зместам прыпавесці. Высвятляецца, што народ начамі працуе, будуе дамы, сее жыта. Навошта? Каму? Можа, каб не развучыцца, не забыцца на свае ўмельства і майстэрства? А можа, каб вярнуўшыся ў знаёмыя

мясціны, знайсці ежу і жытло для сябе?

Незнаёмы спрабуе ўлучыцца ў гэты народ, паяднацца з ім, але яго не прымаюць у свой гурт, адхіляюць яго рукі, абыходзяць яго, відушчага. І нарэшце нервы Спадарожніка не вытрымліваюць, ён узрываецца, пратэстуе, бо *"жыць сярод маўчання, ісці сярод маўчання, маўчаць самому і ў адказ чуць тое ж самае маўчанне – гэта невыносна цяжка і недарэчна"* [4, 166]. Толькі стваральная праца ноччу разам з людзьмі-прывідамі разрывае ланцуг недаверлівасці і непрымання натуральнага, рэальнага чалавека з рэальнага жыцця ў шчыльны, падпарадкаваны нейкай звышідэі натоўп. Падарожны зразумеў, *"што народ гэты запланаваны на будучыню. Быццам зараз у яго няма жыцця, а ён працуе і жыве толькі на заўтрашні дзень – як усё роўна продкі ахвяравалі сабою дзеля нашчадкаў"* [4, 193], а тое, што застаецца пасля маўклівых людзей-зданяў, прывідаў, створанае іх рукамі, рана ці позна знойдуць наперадзе нашчадкі. Зразумеў таксама, што вядуць гэты народ Мудрасць (Белабог) і Прыгажосць – дзяўчына-казка. Ад разумення Спадарожнаму становіцца лягчэй думаць, галава яго чысцее, ён пачынае паступова разумець размову рукамі, але пакуль разгадвае толькі словы "радыяцыя", "зомбі" і такім чынам даведваецца пра жудасна-жахлівую катастрофу, якая вымусіла народ пакінуць сваю зямлю. Валадар ахвяруе Прыгажуню Незнаёмаму, каб нарадзіліся дзеці, што змогуць бачыць, размаўляць, чуць. І тады выпадкова відушчы Спадарожнік прыходзіць да высновы, што народ шукае сябе, будуе і сее, каб некалі вярнуцца назад. Чалавеку вельмі часта, каб зразумець сапраўдную каштоўнасць свайго жыцця, трэба апынуцца ў нейкім памежным становішчы, у віртуальнай рэальнасці – падкрэслівае мастак слова. Вярнуўшыся да свайго былога, звыклага дачнага жыцця, Вандроўнік ужо не можа ўспрымаць яго ўсур'ёз, а тое жыццё, дзе засталіся мудры Белабог, каханая Прыгажуня, дзе расце яго сын, якому давераць нешта важнае, які, можа, увогуле стане правадыром, Галоўным Сейбітам, відушчым сярод астатніх невідушчых, – здаецца яму галоўным і важным. І ён кідаецца ў пагоню за белымі прывідамі.

Падвядзем вынікі нашых разважанняў: народ, выгнаны моцнай тэхнагеннай катастрофай з родных мясцінаў, шукае сябе, выконвае кожную ноч свае спрадвечныя заняткі і абавязкі – сее і будуе, каб потым, пасля доўгага блукання, адшукаўшы нешта важнае, нікому невядомае, вярнуцца назад, ідучы ўперад, сабраць плён працы сваёй. "Тыя, што ідуць" – прыпавесць-папярэджанне пра магчымую страту сваёй Бацькаўшчыны, сваёй памяці і гісторыі. Гэты твор працягвае ідэю пошукаў народам сябе, напамінае, што чалавек, нягледзячы на свой востры зрок, часам не бачыць, куды вядзе яго шлях цывілізацыі, заснаванай на разбурэнні і знішчэнні прыроды і чалавечага ў чалавеку, прыклад таму – злавесны Чарнобыль. Напрыканцы хочацца прывесці словы Янкі Сіпакова з яго цыкла мініяцюр "Узятак з маўчання", напісаных пад уплывам наступстваў чарнобыльскай трагедыі: *"Што такое жыццё? Гэта адзінства, узаемаразуменне і садружнасць зямлі, вады, паветра і агню. І яшчэ – думкі. Але думка можа і не адбыцца, калі няма папярэдняга ўзаемаразумення. А можа, наадварот, думка якраз і з'яўляецца насуперак такому адзінству і такой садружнасці?"*

**Літаратура**

1. **Купала Я.** Жыве Беларусь: Вершы, артыкулы. – Мінск, 1993.

2. **Рагойша В.** Тэорыя літаратуры ў тэрмінах: Дапаможнік. – Мінск, 2001.

3. **Сіпакоў Я.** Выбраныя творы: У 2 т. Т. 1. – Мінск, 1995.

4. **Сіпакоў Я.** Тыя, што ідуць: Кніга прытчаў. – Мінск, 1993.

*Дайсці да Беларусі*

# ГОМЕЛЬСКАЕ ПАЛЕССЕ – СПЕЎНЫ КРАЙ

Тут усё напоўненае музыкай. Яна звініць у паветры, меладычна пераліваецца ў вершалінах дрэў векавых бароў, мройна вісіць над затокамі, плаўна цягнецца ўздоўж рачных берагоў, сцелецца над квяцістымі лугамі. Тут уся прастора спявае. І ўсе спяваюць. З песняй нараджаюцца, з песняй працуюць, песняй асвятляюць сваё жыццё.

Колькі музычных самародкаў выпеставала палеская зямля! Сярод іх нашы сучаснікі – Уладзімір Буднік і Мікалай Сацура, Міхась Дрынеўскі і Валянціна Пархоменка, Міхась Пацук і Мікола Котаў... шэраг вакалістаў і музыкаў Дзяржаўнага акадэмічнага народнага хору імя Генадзя Цітовіча, артыстаў Дзяржаўнай акадэмічнай харавой капэлы імя Рыгора Шырмы, салісты ансамбля народнай музыкі "Бяседа", кіраўнікі многіх калектываў мастацкай самадзейнасці...

А калі ўважліва прыгледзецца да карты нашай краіны – зразумееш: сама Прырода зрабіла гэты край спеўным, музычна адораным, духоўна багатым. Лясы і лугі, вадаёмы і балоты ўтрымліваюць незлічоны запас прыроднай касмічнай энергіі, і яна натхняе людзей, пабуджае іх да ўзнёслага выяўлення, да песні. Гэты палескі куточак узмоцнены і той духоўнай энергіяй, якую з усёй Беларусі нясуць сюды воды буйных рэк – Дняпра і Сожа, Бярэзіны і Прыпяці. Тут усё ў руху, у пачуццях, у песні. Гомельскае Палессе – самы спеўны край Беларусі.

**Міхась ШАВЫРКІН.**